**Л.С.Таірава**

## *Актывізацыя домравага выканальніцтва на Беларусі ў сучасны перыяд*

Актывізацыя домравага выканальніцтва як у Расіі, так і ў Беларусі прыходзіцца на пачатак 70-х гадоў і звязана перш за ўсё з наладжваннем конкурсаў у галіне народна-інструментальнага мастацтва. Менавіта ў гэтыя гады ў Расіі пасля значнага перапынку (з 1939 года) пачынаюць праводзіцца конкурсы выканаўцаў на народных інструментах: Першы Усерасійскі конкурс адбыўся ў 1972 годзе ў Маскве, другі – у 1979 г. у Ленінградзе. Дагэтуль "народнікі" не мелі сваіх прафесійных конкурсаў і вымушаны былі ўдзельнічаць у конкурсах артыстаў эстрады. Так, напрыклад, у 1974 годзе беларускія музыканты — прадстаўнікі народна-інструментальнага выканальніцтва — прынялі ўдзел у конкурсе артыстаў эстрады, дзе вельмі добра сябе праявілі. Сярод яго пераможцаў быў дамрыст Л.Чарняк. Ён стаў дыпламантам гэтага конкурсу. У Беларусі спецыялізаваных конкурсаў для сталых выканаўцаў на народных інструментах не было да 1987 года, калі адбыўся Першы рэспубліканскі конкурс імя І.Жыновіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэтыя конкурсы спрыялі з'яўленню шэрага цікавых таленавітых выканаўцаў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё домравага выканальніцтва ў 1970 — 90-я гг. Сярод іх У.Якаўлеў, Р.Бялоў, Т.Вольская, В.Круглоў, А.Цыганкоў і інш. (Расія), Л.Смялкоўскі, Л.Чарняк, М.Марэцкі і інш. (Беларусь). Многія з гэтых выканаўцаў вызначаюцца не толькі выдатным валоданнем сваім інструментам, але і паспяховым засваеннем кампазітарскай тэхнікі, што асабліва ярка праяўляецца ў пералажэннях, у апрацоўках народных мелодый.

Найбольш плённа ў галіне стварэння арыгінальнага рэпертуару працуе А.Цыганкоў, таленавіты расійскі дамрыст-віртуоз, кампазітар, педагог, грамадскі дзеяч. Ён з'яўляецца заснавальнікам высокамастацкага домравага рэпертуару, на якім грунтуецца вышэйшая выканальніцкая школа. А.Цыганковым створаны цудоўныя, глыбока народныя па змесце і сучасныя па музычнай мове кампазіцыі, якія атрымалі шырокае прызнанне і распаўсюджванне ў народна-інструментальным музычным асяроддзі. Сярод яго твораў "Травушка-муравушка", "Інтрадукцыя і чардаш", "Частушка", "Танцавальныя найгрыны", "Галубка" (на тэму вядомай кубінскай мелодыі) і інш. Тое, што стварае А.Цыганкоў, прынцыпова адрозніваецца ад напісанага раней. Кампазітар не абмяжоўваецца толькі цытаваннем альбо вар'іраваннем народных мелодый, ён намагаецца максімальна поўнага развіцця драматургіі вобраза, прычым робіць гэта з рэдкім адчуваннем меры, тактоўна, высокапрафесійна. Напрыклад, у "Старагародскай сюіце", заснаванай на танцавальных рытмах, што бытавалі ў Расіі ў пачатку нашага стагоддзя, кампазітар здолеў наблізіць музычную культуру тых гадоў да мастацкай эстэтыкі нашага часу. Гэты твор раскрывае перад намі багацце і самабытнасць гарадскога фальклору дарэвалюцыйнай Расіі з пункту гледжання сучаснага мастака.

Шматграннасць таленту А.Цыганкова дазваляе яму дакранацца да зусім нечаканых музычных пластоў. Ён смела і дасведчана ўваходзіць у сферу эстрадна-джазавай музыкі і такім чынам даказвае, што на домры можна выконваць кампазіцыі накшталт "Джазавага экспромта" ці п'есы-жарту "Перавоз Дуня трымала". Сваёй творчасцю і майстэрствам А.Цыганкоў паказаў, што праз народную аснову ў сучасным яе тлумачэнні магчыма паспяховае развіццё выканальніцтва на народных інструментах. Салісты-выканаўцы розных спецыяльнасцей — цымбалісты, балалаечнікі, кіраўнікі аркестраў і ансамбляў народных інструментаў — звяртаюцца да творчасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтага кампазітара не толькі з-за сваіх музычных сімпатый, але і таму, што сярод "народнікаў" пакуль што мала такіх талентаў, як А.Цыганкоў.

Творчасць А.Цыганкова пэўным чынам уплывае на развіццё і беларускай домравай школы, і народна-інструментальнага выканальніцтва ў цэлым. Некаторыя беларускія кампазітары па прыкладзе А.Цыганкова стварылі цікавыя арыгінальныя творы ў джазавым стылі – "На скрыжаванні" В.Кур'яна, "Рытмічная мініяцюра", Сюіта для дзвюх домр і фартэпіяна А.Шпянёва і інш.

А.Цыганкоў не толькі бліскучы музыкант-выканаўца, артыст, педагог, кампазітар, ён яшчэ і арганізатар сучаснага домравага выканальніцтва. Сацыяльна-творчая актыўнасць А.Цыганкова распаўсюджваецца далёка за межамі адзінай інструментальнай галіны і сацыякультурнай прасторы. Ён часты госць у Беларусі. І гэта не толькі гастролі артыста, але і творчыя сустрэчы, кансультацыі нашых выканаўцаў і выкладчыкаў усіх звёнаў музычна-адукацыйнай лесвіцы, майстар-класы, сумесныя творчыя праекты. Амаль ніводнае культурнае мерапрыемства ў галіне народна-інструментальнага мастацтва Беларусі не абыходзіцца без удзелу А.Цыганкова ці іншых расійскіх музыкантаў (утварэнне Асацыяцыі беларускіх дамрыстаў і мандалістаў, фестываль памяці Г.Жыхарава, 80-годдзе з дня нараджэння І.Жыновіча, юбілейныя святкаванні ў гонар 100-годдзя існавання домры і стварэння Вялікарускага аркестра і інш.), таксама як і аналагічныя расійскія мерапрыемствы не абыходзяцца без удзелу беларускіх выканаўцаў.

Такім чынам, пашырэнне культурнага абмену, творчых кантактаў у галіне домравага выканальніцтва паміж дзвюма краінамі спрыяла выхаду беларускай домравай школы на міжнародную музычную прастору. Яскравае пацвярджэнне таму — пераканаўчыя перамогі беларускіх выканаўцаў на расійскіх і міжнародных конкурсах.

У 70-я гады ў Беларусі вылучыўся шэраг таленавітых дамрыстаў (А.Халімчанкоў, Л.Чарняк, Я.Валасюк, крыху пазней — А.Сакалоўская, А.Шоман, Ю.Валіцкі, У.Воранаў, С.Барэйка, Л.Буянава і інш.).

Мікалай Марэцкі быў першы, хто пачаў (у 1988 г.) выступаць на сцэне Белдзяржфілармоніі як дамрыст-саліст. Дзякуючы поспехам айчыннай педагогікі і такім выканаўцам, як М.Марэцкі, домра заняла сваё годнае месца на канцэртнай эстрадзе. У гэтага інструмента з'явілася нямала

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аматараў і прыхільнікаў, якія захапляюцца яе непаўторным гучаннем, багаццем тэхнічных і выразных магчымасцей.

Яшчэ ў Белдзяржкансерваторыі выявіліся выдатныя выканальніцкія здольнасці М.Марэцкага: віртуозная тэхніка, яркі тэмперамент, надзвычай шырокая палітра гукавых фарбаў. Перайграўшы амаль усю арыгінальную музыку, што створана для домры, М.Марэцкі ўзяўся за вельмі складаны скрыпічны рэпертуар. У гэты перыяд ім былі выкананы такія творы, як "Ронда-капрычыёза" К.Сен-Санса, капрысы Н.Паганіні, канцэрты Ф.Мендэльсона і В.Моцарта. Але бясспрэчнай вяршыняй у гэтым пераліку з'яўляюцца "Д'ябальскія трэлі" Д.Тарціні. У той час М.Марэцкі літаральна ашаламіў публіку адважным выкананнем гэтага найскладанейшага твора, даступнага далёка не ўсім скрыпачам, не кажучы ўжо пра дамрыстаў. Бо што такое домра ў параўнанні са скрыпкай? Тыя ж чатыры струны, той жа строй і нават лады, якія дазваляюць адразу адшукаць патрэбны гук. Але, калі скрыпачу досыць лёгкага дотыку пальцаў, каб атрымаць гук, дык дамрысту для гэтага неабходна прыкласці сілу ў некалькі кілаграмаў кожным пальцам! Цяпер можна сабе ўявіць, як складана выконваць на домры Д.Тарціні з яго двайнымі, сапраўды д'ябальскімі, трэлямі. Тады гэта здавалася неверагодным.

Такі чалавек, як М.Марэцкі, не мог задаволіцца дасягнутым. Са студэнцкіх гадоў у ім ясна праглядаў дух смелага эксперыментатара. Ён увесь час знаходзіцца ў стане творчага пошуку і нязменна спрабуе сябе ў новай якасці. Кола яго музычных інтарэсаў сягае далёка за межы народнаінструментальнага мастацтва. У выніку такога творчага эксперыменту ў 1983 годзе з'явіўся унікальны дуэт домры і гітары — М.Марэцкага і В.Жывалеўскага. Не выпадкова двое таленавітых музыкантаў знайшлі адзін аднаго. Іх творчае супрацоўніцтва аказалася ў такой ступені плённым, што прынесла ім бясспрэчную перамогу на VII Усесаюзным конкурсе артыстаў эстрады ў Маскве. Нечаканае, рэдкае і дзівосна гарманічнае спалучэнне домры і гітары, ды яшчэ ў такім незвычайным для народнікаў жанры эстрады, з'явілася сапраўднай сенсацыяй для публікі і членаў журы. Выконваючы эстрадную музыку Я.Глебава, А.Шпянёва і класічныя мініяцюры Дз.Шастаковіча, беларускія музыканты паказалі віртуознае валоданне інструментам, тонкі мастацкі густ і бліскучае ўменне аранжыроўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Здавалася, усе магчымыя вяршыні заваяваныя. Перамога на такім прэстыжным конкурсе адчыняла маладым артыстам усе дзверы канцэртнай эстрады. Але ... выдатны ансамбль праіснаваў тады нядоўга і распаўся гэтак жа хутка, як і ўзнік. Межы дуэта для такіх маштабных асоб, як М.Марэцкі і В.Жывалеўскі, аказаліся цеснымі. І яны пайшлі кожны сваім непаўторным шляхам.

Супрацоўніцтва з рознымі музыкантамі, удзел у самых разнастайных ансамблях дазволілі М.Марэцкаму набыць неацэнны вопыт ансамблевай ігры, уменне тонка і гнутка музіцыраваць з артыстамі самага рознага амплуа, узроўню і таленту. А сувязь з такімі музыкантамі, як Я.Глебаў, А.Шпянёў, І.Лучанок, Н.Гайда і іншыя, адшліфавала выканаўчае майстэрства М.Марэцкага, пашырыла яго мастацкія даляглады. Творы беларускіх аўтараў займаюць належнае месца ў яго рэпертуары. Безумоўнай мастацкай удачай М.Марэцкага з'яўляецца трыпціх "Музычныя эскізы" А. Шпянёва, "Іспанскі трыпціх" А. Белашыцкага, творы А.Рашчынскага, Р.Суруса і іншых кампазітараў.

М.Марэцкі — чалавек, які пастаянна, штодзённа самаўдасканальваецца, адточвае не толькі сваё выканаўчае майстэрства, але і свой інтэлект, шукае натхненне часам у самых розных формах музычнай творчасці. Таму заканамерна, што сярод сваіх музычных аўтарытэтаў М.Марэцкі назваў Я.Хейфіца, Д.Ойстраха, М.Растраповіча, С.Рыхтара. Майстэрства такіх знакамітых музыкантаў — гэта не толькі прадмет захаплення М. Марэцкага, гэта яшчэ своеасаблівая школа выканаўчага майстэрства. І ў гэтым сэнсе становіцца зразумелым зварот музыканта да творчасці К.Дэбюсі, А.Месіяна, Ф.Пуленка. Найбольшую складанасць у выканальніцкім сэнсе ўяўляе п'еса "Трысцё" Ф.Куперэна, напісаная для клавесіна. Сваім пераладжэннем і выдатным выкананнем гэтай элітарнай музыкі, разлічанай на спецыялістаў, М.Марэцкі пакарыў журы конкурсу "Кубак Поўначы" ў 1993 годзе, дзе ён заваяваў першую прэмію і званне лаўрэата, пакарыў пераладжэннем і выкананнем фіналу Фартэпіяннага канцэрта соль-мінор К.Сен-Санса. Цяжка сабе ўявіць, але М.Марэцкаму ўдалося "ўкласці" фартэпіянную фактуру канцэрта К.Сен-Санса ў чатыры домравыя струны і пры гэтым захаваць мастацкія вартасці твора.

І гэта яшчэ адно сведчанне таленту М.Марэцкага, неардынарнасці яго музычнага мыслення. Ён вывеў домру на новыя абсягі інструментальнага мастацтва і даказаў, што на гэтым інструменце можна іграць музыку, якая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

створана для самых розных інструментаў — скрыпкі, фартэпіяна, клавесіна і інш.

Класічна строгая манера ігры Марэцкага, пазбаўленая знешніх эфектаў, вызначаецца віртуознасцю, тэхнічнай дасканаласцю, артыстызмам і моцным унутраным напалам. Каскады захапляльных пасажаў, бісерная тэхніка падвойных нот, крыштальная чысціня трэляў, флажалетаў, мноства разнастайных прыёмаў ігры, запазычаных у скрыпачоў, балалаечнікаў, гітарыстаў, — гэта няпоўны пералік выканаўчых сродкаў дамрыста. Але галоўная заслуга Марэцкага — надзвычайнае пашырэнне фактурнага дыяпазону домры. У яго умелых руках яна набыла сапраўды аркестравае гучанне і тым самым быццам бы выйшла за межы народна-інструментальнага мастацтва. Сёння домру з поўным правам можна разглядаць як акадэмічны інструмент, роўны па магчымасцях такім класічным інструментам, як скрыпка, віяланчэль, гітара і інш.

Значная частка выканаўчай творчасці Мікалая Марэцкага прысвечана мандаліне. Гэты блізкі домры інструмент італьянскага паходжання некалькі дзесяцігоддзяў назад быў даволі папулярны на тэрыторыі Беларусі, і ў многіх сем'ях мандаліна займала пачэснае месца. Але чамусьці мандаліну аднеслі да ліку чужародных, "нетутэйшых" інструментаў, і паступова яна аказалася на мяжы поўнага знікнення. Адраджэнню гэтага некалі любімага і папулярнага ў беларусаў інструмента Мікалай Марэцкі аддае шмат часу і сіл. Зварот да мандаліны — гэта не даніна модзе, а хутчэй патрэба самавыяўлення, якая доўгі час не знаходзіла выйсця. Гэта яшчэ і жаданне "ўзняць" багаты, арыгінальны рэпертуар, бо для мандаліны пісалі такія вядомыя кампазітары, як А.Вівальдзі, І.Гумель, А.Самарціні, Д.Хофман і інш. Яе выкарыстоўвалі ў сваіх партытурах В.Моцарт, С.Пракоф'еў, Д.Вэрдзі.

За параўнальна кароткі тэрмін М.Марэцкі не толькі выдатна авалодаў інструментам і засвоіў зусім новы мандалінны рэпертуар салоннай музыкі Ф.Рыса, Э.Мецакапа, Ж.Фіесты, але і ўзбагаціў гэты рэпертуар уласнымі пераладжэннямі, прызначанымі і для домры, і для мандаліны. Найбольш значнае з іх "Ронда-капрычыёза" К.Сен-Санса — твор, які ніхто, акрамя М.Марэцкага, не адважыўся выканаць на мандаліне (калі не лічыць выканання гэтага музычнага шэдэўра на домры Л.Чарняком яшчэ ў пачатку 70-х гадоў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошнія гады ў Камернай і Вялікай залах філармоніі прагучала шмат новых цікавых канцэртных праграм дамрыста і мандалініста М.Марэцкага — "Гучаць народныя інструменты", "Вечар добры на вечар домры", "Французская музыка", "Мандалінныя прэм'еры" і шмат іншых. М.Марэцкі здолеў прыцягнуць да ўдзелу ў гэтых канцэртных праграмах музыкантаў самых розных інструментальных накірункаў і сацыя-культурнай прасторы: скрыпачоў, гітарыстаў, сваіх паплечнікаў па мастацтве, выканаўцаў блізкага і далёкага замежжа. Усё гэта значна пашырыла абсягі айчыннага домравага выканальніцтва, наблізіла яго да сучасных эталонаў музычнай культуры.

Яшчэ адна галіна дзейнасці М.Марэцкага — педагогіка. Ён дацэнт Беларускай акадэміі музыкі, выхаваў больш за 40 маладых выканаўцаў-дамрыстаў. Сярод іх лаўрэаты рэспубліканскіх конкурсаў Уладзімір Воранаў, Святлана Барэйка, Тамара Лясун, дыпламант Ларыса Буянава. Адна з яго вучаніц-мандаліністак Н.Змітровіч на III Міжнародным конкурсе выканаўцаў на народных інструментах у Чарапаўцы заняла трэцяе месца і званне лаўрэата. Гэта вельмі важнае сведчанне грунтоўнага, паступовага росту айчыннай домравай выканальніцкай школы.

М.Марэцкі — чалавек шматгранны, разнастайна адораны, вылучаецца велізарнай працаздольнасцю. Яго напружанае творчае жыццё складаецца не толькі са шматлікіх рэпетыцый, канцэртаў, гастрольных паездак, педагагічнай працы, запісаў на радыё і тэлебачанні. Пры яго непасрэдным удзеле ў пачатку 90-х гадоў была створана Асацыяцыя беларускіх дамрыстаў і мандаліністаў, галоўная мэта якой — адраджэнне некаторых страчаных традыцый народна-інструментальнай культуры, развіццё і распаўсюджванне домрава-мандаліннага мастацтва ў Беларусі. М.Марэцкі з'яўляецца віцэ-прэзідэнтам гэтай Асацыяцыі.

Як вялікую творчую ўдачу М.Марэцкага можна разглядаць запіс на кампакт-дыск музыкі Вівальдзі з аркестрам "Паўночная карона" і прафесарам В.Кругловым. А званне лаўрэата першай прэміі Міжнароднага конкурсу "Кубак Поўначы" ў Чарапаўцы — гэта вынік і своеасаблівы пункт адліку, пачатак новага этапу ў развіцці гэтага яркага і таленавітага музыканта.

Сацыяльна-творчая актыўнасць М.Марэцкага, імкненне заўсёды знаходзіцца ў гушчы культурнага жыцця, дзе выкрышталізоўваюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкія прынцыпы і фарміруецца выканаўчае майстэрства музыканта, у сучасны момант набылі зваротнае дзеянне. Шматлікія кантакты і творчае супрацоўніцтва з найбольш вядомымі музыкантамі блізкага і далёкага замежжа, шырокая геаграфія гастрольных маршрутаў выліваюцца ў самыя смелыя культурныя праекты, якія М.Марэцкі паспяхова ажыццяўляе. Па яго ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле двойчы ў Мінску праводзіліся міжнародныя фестывалі мандалiннай музыкі з прыцягненнем мандалiністаў Беларусі, Расіі і Германіі.

Сваім мастацтвам, сваёй творчасцю М.Марэцкі здольны пераканаць, зацікавіць, далучыць да супрацоўніцтва не толькі сваіх калег і паплечнікаў па мастацтве А.Цыганкова, В.Круглова, М.Камалятава, мандалiністаў Марыяну і Бруна Гас з Германіі, але і сусветна вядомых музыкантаў, такіх як М.Растраповіч. Не выпадкова, што менавіта нашых беларускіх музыкантаў на чале з М.Марэцкім гэты знакаміты дырыжор запрасіў для ўдзелу ў яго пастаноўцы балета С.Пракоф'ева "Рамэо і Джульета", якая з поспехам прайшла ў Літве, Егіпце, Грэцыі. Усё гэта сведчыць аб інтэграванні нашага айчыннага народна-інструментальнага мастацтва ў сістэму агульнанацыянальных культурных каштоўнасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ